Бяспека

# У РЭЖЫМЕ ПАЗАШТАТНАЙ СІТУАЦЫІ

## Маштабныя вучэнні ратавальнікаў прайшлі пад Барысавам

**Да магчымага ўзнікнення надзвычайных сітуацый трэба быць гатовым заўжды. Гэтая работа заўжды вымагае не толькі вялікіх часавых і матэрыяльных выдаткаў, але і адпаведнай каардынацыі. У адной звязцы разам з ратавальнікамі мусяць працаваць медыкі, нафтахімікі, энергетыкі, камунальнікі...**


Фота БелТА.

І для таго, каб гэты механізм не прастойваў, раз на тры гады першыя асобы органаў дзяржаўнага кіравання і некаторых канцэрнаў, якія ўваходзяць у кіруючы склад Дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый і грамадзянскай абароны, і чыя дзейнасць носіць стратэгічны характар, адпраўляюцца на рэспубліканскі збор. Сёлета ён прайшоў у Барысаўскім раёне. Кіраваў ім **прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС.**

Удзельнікі збору азнаёміліся з работай нядаўна адкрытага Цэнтра бяспекі жыццядзейнасці і матэрыяльна-тэхнічнай базай Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі. У апошнім навучаюцца не толькі ратавальнікі, але і прадстаўнікі іншых міністэрстваў і ведамстваў.

Другая частка збору прайшла на тактычным палігоне. Там была арганізавана выстаўка пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі і новых узораў баявой вопраткі ратавальнікаў. Магчымасці абсталявання былі прадэманстраваны ўжывую. У тым ліку — і на паказальных вучэннях з прымяненнем авіяцыі.

Ратавальнікі сумесна з іншымі сіламі і сродкамі ДСНС ліквідавалі надзвычайную сітуацыю на аб'екце нафтаперапрацоўкі, патушылі трансфарматарную падстанцыю. Госці таксама ўбачылі, як адбываюцца выратавальныя работы ў разбураных будынках; падчас дарожна-транспартных здарэнняў з аўтамабілямі, што транспартуюць радыеактыўныя рэчывы; на чыгунцы ў выпадку, калі здарэнне адбылося з ёмістасцю, што перавозіць небяспечныя хімічныя злучэнні... Ну і, натуральна, тое, чым спецыялісты службы 101 займаюцца пастаянна — выратаванне на вадзе, тушэнне лясных пажараў.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што сёння ўвесь кіруючы склад ДСНС змог пераканацца ў тым, што МНС здольна якасна выконваць пастаўленыя перад ім задачы.

— У Беларусі выбудавана на дзяржаўным узроўні сістэма папярэджання і ліквідацыі НС, — заявіў Сяргей Румас. — Але жыццё не стаіць на месцы. Увесь час з'яўляюцца новыя выклікі. І, адпаведна, гэтая сістэма таксама павінна змяняцца для таго, каб мець на іх адпаведную рэакцыю.

Але процідзейнічаць надзвычайным сітуацыям мусіць не толькі профільнае міністэрства.

— Вельмі шмат залежыць ад мясцовых органаў улады, кіраўнікоў прадпрыемстваў, — падкрэсліў кіраўнік ўрада. — Апошнім часам у краіне адбываецца памяншэнне нагляднай нагрузкі на аб'екты эканомікі, адначасова падвышаецца адказнасць кіраўнікоў за бяспеку сваіх работнікаў, за бяспеку людзей на тых аб'ектах, якія яны ўзначальваюць.

**Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА** заўважыў, што кіруючы органаў дзяржаўнага кіравання павінны валодаць сітуацыяй у сферы бяспекі. І такія практычныя заняткі неабходны.

— Большасць прысутных міністраў уваходзяць у склад камісіі па НС, якая каардынуе ўсю дзейнасць ДСНС. Вельмі важна, каб яны ўсведамлялі ўсю адказнасць і правільна працавалі ў той ці іншай сітуацыі, — адзначыў Уладзімір Вашчанка. — Таму што ліквідацыя НС патрабуе велізарных выдаткаў і ў той жа час кваліфікаваных дзеянняў. Натуральна, што пры гэтым неабходна работа медыцынскіх, аварыйных службаў, службаў ЖКГ, энергетыкаў, нафтахімікаў. Усе павінны выразна ўзаемадзейнічаць для вырашэння тых ці іншых задач.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Другі тур прэзідэнцкіх выбараў у Літве адбудзецца 26 мая



Розніца ў выніках эканаміста Гітінаса Наўседы і экс-міністра фінансаў Інгрыды Шыманітэ, якія выйшлі ў другі тур выбараў прэзідэнта Літвы, склала 0,18 працэнта. Аб гэтым сведчаць звесткі Галоўнай выбарчай камісіі рэспублікі пасля апрацоўкі ўсіх даных. Паводле інфармацыі Выбаркама, пасля падліку бюлетэняў з 1972 участкаў Шыманітэ набрала 31,13 працэнта галасоў, а Наўседу падтрымалі 30,95 працэнта выбаршчыкаў. Яны выходзяць у другі тур, паколькі для перамогі ў першым кандыдату ў прэзідэнты неабходна набраць не менш за палову галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні. Трэцяе месца з 19,72 працэнта галасоў заняў дзеючы прэм'ер-міністр Літвы Саўлюс Сквернявіс, які ўжо заявіў, што мае намер падаць у адстаўку з пасады кіраўніка ўрада, паколькі не здолеў прайсці ў другі тур. У выбарах кіраўніка Літвы ў мінулую нядзелю прымалі ўдзел дзевяць прэтэндэнтаў. Паводле заканадаўства рэспублікі, другі тур праходзіць праз два тыдні пасля першага.

## Bloomberg прыраўняў наступствы гандлёвай вайны Трампа да зыходу крызісу 2008 года

Тупік у амерыкана-кітайскіх гандлёвых перагаворах адлюстроўвае падзенне даверу паміж Вашынгтонам і Пекінам, а таксама павелічэнне рознагалоссяў, якія наўрад ці будуць вырашаны ў найбліжэйшы час, адзначыла агенцтва Bloomberg. ЗША і Кітай паспрабавалі прадэманстраваць спакой пасля апошняга раўнда перагавораў і заявілі, што плануюць працягнуць іх у надзеі пазбегнуць краху на рынках і маштабнага эканамічнага ўрону. Такія знешне бясклапотныя паводзіны хаваюць фундаментальныя ўнутраныя супярэчнасці, адзначаецца ў матэрыяле Bloomberg. Нявызначанасць у гандлёвай вайне, якая захоўваецца, пагражае вялікімі ўзрушэннямі для фінансавых рынкаў. Эскалацыя гандлёвай вайны паміж дзвюма найбуйнейшымі эканомікамі свету ўсё больш нагадвае найгоршы сцэнарый для сусветнай эканомікі падчас фінансавага крызісу 2008 года, які, дарэчы, ужо прагназуецца сёлета. Мяркуецца, што прэзідэнт ЗША Дональд Трамп сустрэнецца са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам на саміце G20 у Японіі, які адбудзецца ў чэрвені, расказаў раней эканамічны саветнік прэзідэнта ЗША Лары Кудлаў. У выхадных ЗША абвясцілі аб увядзенні 25-працэнтных пошлін на імпарт з Кітая на суму $300 млрд. Пекін прыме меры ў адказ.

## Выдаткі на абарону краін Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна сёлета перавысяць паўтрыльёна долараў

Выдаткі на абарону краін Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна (АЦР) у 2019 годзе дасягнуць $ 515 млрд, што менш, чым у Паўночнай Амерыцы, але больш, чым у Еўропе. Пра гэта паведаміў кіруючы дырэктар кампаніі Experia Events Лэк Чэт Лам напярэдадні адкрыцця ў Сінгапуры Міжнароднай канферэнцыі і спецыялізаванай выстаўкі ваенна-марской тэхнікі і ўзбраенняў IMDEX Asia 2019. Паводле яго слоў, «ужо праз 10 гадоў выдаткі на абарону ў АЦР будуць найбуйнейшыя ў свеце». Кіраўнік кампаніі, якая з'яўляецца арганізатарам IMDEX Asia, падкрэсліў, што «рост абаронных выдаткаў абумоўлены шмат у чым распрацоўкай і ўкараненнем найноўшых тэхналогій». «Развіццё высокіх тэхналогій нясе ў сабе пэўныя пагрозы, таму ўзброеным сілам неабходна быць гатовымі супрацьстаяць як традыцыйным пагрозам, так і новым», — адзначыў Лэк Чэт Лам. Як вядома, IMDEX Asia праходзіць у Сінгапуры кожныя два гады. Гэтым разам удзел у ёй прымаюць больш за 230 кампаній з 30 краін. Акрамя таго, прыбылі 22 караблі з 15 дзяржаў, у тым ліку Аўстраліі, Індыі, Кітая, ЗША і Японіі.

Надвор'е

# Прыгрэе нарэшце па-майску

## Нам абяцаюць да плюс 24 градусаў, але месцамі і дажджы з навальніцамі

Пагодныя ўмовы ў другой дэкадзе мая на тэрыторыі краіны будзе ў асноўным вызначаць цёплая вільготная паветраная маса, якая паступіла да нас з тэрыторыі Украіны. Да серады чакаецца няўстойлівае надвор'е з кароткачасовымі дажджамі. У другой палове тыдня пераважны ўплыў будзе аказваць перыферыя скандынаўскага антыцыклону, які сфарміраваўся ў больш прахалодным паветры паўночных шырот. У гэты час месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, якія будуць у асноўным у паўднёвых і паўднёва-заходніх раёнах краіны, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У сераду на большай частцы Гродзенскай і Брэсцкай абласцей і месцамі на астатняй тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 6 градусаў па поўначы да 13 цяпла па поўдні краіны. Удзень будзе ў асноўным ад плюс 16 да плюс 22 градусаў, па паўднёва-ўсходнім рэгіёне краіны паветра прагрэецца да 24 цяпла.

У чацвер месцамі па краіне, а па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — на большай частцы тэрыторыі, пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымы сур'ёзныя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 6 градусаў па поўначы да 14 градусаў вышэй нуля па поўдні краіны. Як заўсёды, удзень будзе значна цяплей — ад плюс 15 да плюс 22 градусаў, па паўднёвым усходзе краіны — да 24 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу месцамі, пераважна на паўднёвым захадзе краіны, чакаюцца кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 градусаў да плюс 14 градусаў, а па поўначы панізіцца да 5 цяпла. Удзень будзе 16—23 градусы са знакам плюс.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Узровень

# ВУЧЫЦЦА САМІМ І ВУЧЫЦЬ СУСЕДЗЯЎ

## Беларусь стала членам Еўразійскага альянсу дзіцячых анколагаў

**Ранняе выяўленне хворых на рак, пошукі новых метадаў лячэння, шпітальнага і пазашпітальнага аказання дапамогі — гэтыя і іншыя пытанні разгледзелі спецыялісты з ЗША, Расіі, Беларусі і іншых краін падчас трэцяй сустрэчы экспертаў Еўразійскага альянсу дзіцячых анколагаў, якая праходзіць у Мінску. А Беларусь стала членам гэтай міжнароднай арганізацыі — адпаведнае пагадненне падпісана падчас сімпозіума.**

У Мінск прыехала больш за 75 дэлегатаў з 11 краін Еўразійскага рэгіёна, прадстаўнікі 11 фондаў і 21 медыцынскай установы. Наша краіна абрана для такой сустрэчы невыпадкова: поспехі беларускіх дзіцячых анколагаў не засталіся незаўважанымі на міжнародным узроўні, і наш вопыт можа быць карысным для іншых краін.

— У сістэме EurADO мы, як і Расія, з'яўляемся эталоннай краінай, — адзначыла **Вольга АЛЕЙНІКАВА, дырэктар РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі.** — Узровень гэтай службы ў Кыргызстане, Таджыкістане, Узбекістане значна ніжэйшы, чым у Беларусі. Таму да нас і прыязджаюць пераймаць вопыт. З нашай дапамогай ужо наладжана работа службы дзіцячай анкалогіі ў Казахстане. Калісьці мы самі вучыліся ў Германіі, Францыі, Швейцарыі, цяпер прыйшоў той час, калі мы павінны перадаваць свой вопыт нашым калегам у СНД.

Штогод у Беларусі рак выяўляецца ў 300 дзяцей. Каля 75 % з іх паспяхова вылечваюцца, пры некаторых формах выжывальнасць дасягае 98 %. Але такая сітуацыя не ва ўсіх краінах.

— Каб уступіць у альянс, неабходны вопыт, добрыя вынікі і патэнцыял развіцця, і беларускія спецыялісты валодаюць гэтымі кампетэнцыямі, — падкрэслівае **першы намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ.** — Тое, што на нашай пляцоўцы сабраліся вядучыя эксперты з усяго свету на чале з прадстаўнікамі Дзіцячага даследчага шпіталя Сент Джуд з ЗША, гэта пацвярджае. Наша сістэма аховы здароўя кладзе ў аснову ранняе выяўленне хваробы і пастаноўку дыягназу на генетычным узроўні, а таксама таргетнае (кропкавае) лячэнне дзіцячай анкалогіі. У многіх краінах свету ранняя дыягностыка і лячэнне — вялікая праблема. Для нас такое міжнароднае супрацоўніцтва таксама будзе карысным у пошуках новых метадаў, тэхналогій і алгарытмаў лячэння.

Як адзначыла Вольга Алейнікава, прычына дзіцячага раку — у «паломках» на малекулярным узроўні. Супраць іх выкарыстоўваецца таргетная тэрапія — як прэпараты, якія прымяняюцца даўно, так і новыя, вельмі дарагія:

— Часам яны яшчэ незарэгістраваныя, праходзяць клінічныя выпрабаванні. Але менавіта яны часта вялікі шанц для дзіцяці. І нават такія прэпараты наша дзяржава закупляе індывідуальна.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае шчырыя спачуванні вядучаму рэферэнту ўпраўлення сацыяльнай палітыкі і навукова-інавацыйнай дзейнасці Сакратарыята Савета Рэспублікі Табаковай Алене Мікалаеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**